# СВЕТ ПЯШЧОТАЮ СОНЦА САГРЭТЫ
*(Міхась Пазнякоў)*



## Чэрвень і Сонейка

*Клаўдзія Каліна*

Бегае Чэрвень з са́менькага ранку і да вечара па садах, палях, лясах, і ні ўпынку, ні адпачынку яму няма. Усюды трэба паспець, усё даглéдзець.

Не паспеў абабе́гчы ўсе сады, паглядзець, ці добрая завязь на дрэвах, як на поле пара́: на жыта зірнуць, падрасціць лён, каб даўжэйшы рос, папрасіць, каб Вецер прыгнаў хмару з дажджом ды астудзіў ад спякоты зямлю...

А тут яшчэ трэба ў лес завітаць, даглéдзець сунічкі, павярнуць іх да Сонейка, каб сокам наліваліся. А Сонейка ўжо на схіле, хутка і вечар...

— Ох, які кароткі дзень! — ска́рдзіцца Чэрвень. — Сонейка, памажы мне, свяці даўжэй.

Сонейка слухае Чэрвеня і кожныя суткі ўсё болей прыбаўляе дня.

Чэрвень за дзень усюды пабывае: паглядзіць, як у лесе даспяваюць сунічкі, загляне ў вожыкаву схованку, паціка́віцца, як гаду́юцца малыя важаняткі, і ў гнёзды птушыныя зазірне. Так за турботамі не заўважае, як бяжыць час. І вось чутна, як звіняць на лузе косы, пачалася касавіца... Новыя клопаты ў Чэрвеня.

— Сонейка, будзь ласкава, прыбаў яшчэ дня! Людзям сена трэба высушыць, — просіць зноў Чэрвень.

Сонейка слухала Чэрвеня, прыбаўляла дня, прыбаўляла ды і перастала.

— Усё! — кажа. — Болей не магу прыбавіць ні хвілінкі... Ночка кры́ўдзіцца, зусім кароценькая стала. Не паспее згаснуць неба на захадзе, як ружавее на ўсходзе!

— І за гэта дзякуй! — кажа Чэрвень. — І так ты мне памагло. Я і садавіну падгадава́ў, я і жыта вы́каласіў, і лён падрасціў,

і ягады сокам наліў... І шмат іншай работы зрабіў. Не сорам майму брату Ліпеню будзе ў вочы глянуць.

Вось чаму ў Чэрвеня самы доўгі дзень і самая кароткая ноч. Гэта Сонейка дружыць з Чэрвенем і памагае яму.

1. Хто з'яўляецца героямі гэтай казкі? Якія рэальныя падзеі ў ёй адлюстраваны?
2. Прачытайце, якую працу выконваюць людзі ў чэрвені.
3. Растлумачце сэнс прыказкі.
   - Чэрвень не гуляе, ураджай люляе.
4. Знайдзіце словы і выразы, якія характарызуюць месяц чэрвень як жывую істоту.

Адгадайце загадку.

Што за такія чатыры пары́,
Што за такія чатыры сястры:
Першая — назбірае вады,
Другая — арэ і сее,
Трэцяя — расціць рупліва плады,
Чацвёртая — есці ўмее?

*Уладзімір Мацвеенка.*

# Колеры года

*Іван Мураўейка*



— Самы прыгожы —
Колер зялёны, —
У маі шапталі
Бярозы ды клёны.

— Самы гарачы —
Золата колер, —
Улетку звінела
Жытнёвае поле.





— Самы ярчэйшы —
Колер чырвоны, —
Увосень рабіна
Шумела штодзённа.

— Самы бліскучы —
Колер бялюткі, —
Спявала зіма
Ў завеевы дудкі.



А дзеці сказалі
Прасторам і сонцу:
— Усе колеры года
Мы любім бясконца!

1. Чаму бярозы і клёны шапталі, што самы прыгожы — колер зялёны? Як можна пачуць іх шэпт?
2. Які колер лічыць самым прыгожым жытнёвае поле? Чаму?
3. Які колер самым яркім назвала рабіна? Чаму?
4. Як назвала белы колер зіма? Чаму? Як вы разумееце сэнс выразу *спяваць у завеевы дудкі*? Паспрабуйце апісаць словамі зімовую песню завірухі.
5. Прачытайце, што сказалі пра колеры года дзеці. Чаму яны не сталі вылучаць сярод колераў самыя лепшыя?
6. Якія колеры года вы лічыце самымі прыгожымі? Чаму?
7. Апішыце словамі малюнкі, якія вам захацелася намаляваць да кожнай часткі верша.